# Музейныя задумы

**Рэспубліканскі форум музеяў устаноў адукацыі сабраў у Мінску больш за 500 удзельнікаў.**

Педагогі, навучэнцы, прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі і культуры нашай краіны, грамадскіх аб'яднанняў, а таксама госці з Расійскай Федэрацыі дзяліліся вопытам работы, абмяркоўвалі пытанні развіцця музейнай педагогікі. Форум стаў завяршальным мерапрыемствам Тыдня музеяў устаноў адукацыі, які праходзіў у краіне з 12 па 18 мая.

У першы дзень форуму — 17 мая — на інтэрактыўнай пляцоўцы, якая размясцілася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, юныя экскурсаводы і кіраўнікі музеяў розных профіляў з усіх рэгіёнаў краіны ярка і захапляльна прэзентавалі экспазіцыі школьных музеяў. Сярод іх — найстарэйшы ў Беларусі народны музей баявой славы, створаны ў Лунненскай сярэдняй школе імя Героя Савецкага Саюза Івана Шарамета Мастоўскага раёна яшчэ ў 1957 годзе (кіраўнік Ларыса Уладзіміраўна Эйсмант), а таксама адзін з унікальных па сваёй тэматыцы музей сельпо сярэдняй школы № 3 Нароўлі. Як падзяліўся яго кіраўнік вядомы педагог-краязнавец Васіль Чайка, у планах — стварэнне яшчэ аднаго цікавага музея, прысвечанага сельскаму клубу.

— Да тэмы сельскага клуба звярнуўся невыпадкова. Гэта арыгінальная частка нашай гісторыі, асабліва савецкага перыяду, — дзеліцца Васіль Васільевіч, стваральнік (увага!) пяці музеяў. — Якой бы цяжкай працай ні займаліся сяляне (а фізічна нашы бацькі і дзяды працавалі нашмат больш, чым мы), яны заўсёды знаходзілі час, каб сходзіць у клуб. Гэта было месца адпачынку, прычым не толькі моладзі. Я памятаю той час, калі ў вясковы клуб на танцы прыходзілі бабулькі ў якасці гледачоў і назіралі за моладдзю. Там адбываліся цікавыя кантакты паміж пакаленнямі.




**Сёння ва ўстановах адукацыі краіны налічваецца каля 1500 музеяў, 120 з іх маюць званне народных. На 1 красавіка 2023 года дзейнічае больш за 1900 асобных экспазіцый, прысвечаных генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Таксама з пачатку навучальнага года створана больш за 400 экспазіцый у дзеючых музеях устаноў адукацыі.**

За тэму сельскага клуба Васіль Васільевіч Чайка ўзяўся грунтоўна. Пачаў з вывучэння першых перасовачных установак, якія ездзілі па вёсках і паказвалі кіно на звычайных прасцінах у сялянскіх дамах. Асобны перыяд гісторыі сельскіх клубаў — Вялікая Айчынная вайна. Але самы багаты перыяд для даследавання — першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. Настаўніку цікавы кінематограф таго часу, музычныя калектывы, унікальныя таленты-самародкі, якія выступалі ў сельскіх клубах. Захопленасць, з якой краязнавец расказваў пра свае планы, не пакідае сумненняў: у Васіля Васільевіча абавязкова атрымаецца стварыць чарговы музей.

Акрамя інтэрактыўнай пляцоўкі, у праграме першага дня форуму было пленарнае пасяджэнне "Музей — адзінства адукацыі і культуры", на якім узнімаліся актуальныя пытанні развіцця музейнай педагогікі, разглядалася дзейнасць асобных музеяў.

— Працэс актыўнага фарміравання школьных музеяў прыпадае на сярэдзіну мінулага стагоддзя. Сёння ва ўстановах адукацыі краіны налічваецца каля 1500 музеяў, 120 з іх маюць званне народных, што з'яўляецца вынікам прызнання іх высокіх дасягненняў у выхаванні моладзі, захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. У 2022 годзе актывізавана работа па стварэнні ва ўстановах адукацыі музейных экспазіцый, прысвечаных генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На 1 красавіка 2023 года дзейнічае больш за 1900 асобных тэматычных экспазіцый. Таксама з пачатку навучальнага года створана больш за 400 экспазіцый у дзеючых музеях устаноў адукацыі, — расказала дырэктар Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Алена Уладзіміраўна Ануфровіч.

Як адзначыў дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Аляксандр Храмой, Міністэрства культуры выказала ініцыятыву аб уключэнні школьных народных музеяў у дзяржаўны рэестр.

— З часам музеі павінны атрымаць ліцэнзію на сваю дзейнасць, каб мы мелі дакладнае ўяўленне, якія прадметы там захоўваюцца і ці адпавядаюць умовы іх захоўвання Кодэксу аб культуры. Павінна быць створана міжведамасная камісія, якая вызначыць каштоўнасць тых ці іншых прадметаў школьных музеяў, каб, напрыклад, пры закрыцці школы, а значыць і ліквідацыі музея, гэтыя прадметы былі перададзены ў іншыя музеі. Мы павінны знайсці баланс, каб школьныя музеі развіваліся ў адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснасці, — падзяліўся Аляксандр Васільевіч.

Урачыстай часткай першага дня форуму стала ўзнагароджанне прызёраў і пераможцаў конкурсу прафесійнага музейнага майстэрства.

Дыпломы Міністэрства адукацыі атрымалі 12 педагогаў. Пераможцам у намінацыі "Лепшая арганізацыя музейнай дзейнасці" стала дырэктар Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі імя Хаіма Суціна Смілавіч Чэрвеньскага раёна Ала Леанідаўна Лаўрыновіч. У намінацыі "Навацыі музейнай дзейнасці" дыпломам І ступені ўзнагароджана кіраўнік музея "Спадчына" сярэдняй школы № 1 Ліды Наталля Анатольеўна Ліханава.

— Задача, якую мы ставілі сумесна з Міністэрствам культуры, задумваючы правядзенне форуму, заключалася не толькі ў тым, каб выявіць лепшых экскурсаводаў, кіраўнікоў музеяў, але і вывесці на прынцыпова новы ўзровень тую работу, якую вы ажыццяўляеце ва ўстановах адукацыі кожны дзень, — звярнуўся да ўдзельнікаў форуму міністр адукацыі Андрэй Іванец.

Па яго словах, калі нашы навучэнцы сутыкаюцца ў музеях з прадметамі мінулага роднага краю, лёсам тых выдатных людзей, якія былі выпускнікамі школ, нарадзіліся ў гэтым краі, то яны чарговы раз упэўніваюцца, што ёсць шмат нагод для гордасці за нашу гісторыю, наш народ, нашу краіну.

Таксама А.Іванец выказаў ідэю аб правядзенні Рэспубліканскага форуму музеяў устаноў адукацыі раз у два гады. Гэта дасць добрую магчымасць паглядзець, якіх вышынь дасягаюць школьныя музеі.

Міжнародны дзень музеяў для ўдзельнікаў форуму быў багатым на падзеі. У Нацыянальным гістарычным музеі юных экскурсаводаў чакала дыялогавая пляцоўка з прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі. Педагогі ж маглі азнаёміцца з вопытам работы прызёраў конкурсу музейнага майстэрства падчас круглага стала "Музеі ўстаноў адукацыі ў адукацыйным і сацыякультурным асяроддзі: захаванне традыцый і перспектывы развіцця", абмеркаваць розныя пытанні.

Цэнтральнай падзеяй учарашняга дня стала адкрыццё выставы музеяў устаноў адукацыі ў гасцінай Уладзіслава Галубка. Гэта сумесны праект Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства і Нацыянальнага гістарычнага музея. Пачынаючы з 19 мая і да канца года ў філіяле музея гісторыі музычнай і тэатральнай культуры будуць штомесяц арганізоўвацца зменныя выставы музеяў устаноў адукацыі розных профіляў. Іх наведванне можа стаць добрым дапаўненнем экскурсіі па сталіцы.

**Ігар ГРЭЧКА.**
**Фота аўтара.**